УДК 378

**Цалко Таццяна Адамаўна**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці г. Мазыра», Мазыр, Рэспубліка Беларусь, ozdcrr@mail.gomel.by*

# ВЫКАРЫСТАННЕ ФАЛЬКЛОРУ Ў РОЗНЫХ ВІДАХ ДЗЕЙНАСЦІ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

У артыкуле прадстаўлены вопыт работы дзяржаўнай установы адукацыі «Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці г. Мазыра» па выкарыстанні фальклору па далучэнні дзяцей дашкольнага ўзросту да беларускай мовы, раскрытыя эфектыўныя формы работы па гэтым напрамку. Вынікі працы сведчаць аб тым, што выхаванцы называюць і правільна прамаўляюць беларускія словы, пераказваюць кароткія казкі і творы як знаёмыя, так і ўпершыню пачутыя.

**Ключавыя словы:** фальклор; беларуская нацыянальная культура; традыцыі.

**Tsalko Tatiana Adamovna**
*Mozyr preschool child development center, Mozyr, Belarus, mozdcrr@mail.gomel.by*

# THE USE OF FOLKLORE IN VARIOUS ACTIVITIES FOR SPEECH DEVELOPMENT OF PRESCHOOL CHILDREN

The article presents the experience of the state educational institution “Mozyr Preschool Child Development Center” on the use of folklore to introduce preschool children to the Belarusian language, reveals effective forms of work in this area. The results of the work show that the pupils call and correctly pronounce Belarusian words, retell short fairy tales and works both familiar and first heard.

**Key words:** folklore; Belarusian national culture; traditions.

**Уводзіны.** Самае дарагое ў жыцці — тое, што закладзена ў сэрца з ранніх год. Менавіта родная мова — сувязное звяно ў далучэнні дзяцей да агульначалавечых каштоўнасцей, традыцый і гістарычнага мінулага нашай Радзімы.

У сувязі з гэтым сам час патрабуе звярнуцца да сваіх вытокаў, далучаць дзяцей да беларускай нацыянальнай культуры, паглыбляць знаёмства з родным краем, беларускімі традыцыямі, фальклорам, прывіваць пачуццё грамадскасці, любоў да Радзімы. Усім вядома, што дашкольны ўзрост з’яўляецца самым спрыяльным перыядам для актыўнага маўленчага развіцця чалавека. Менавіта ў гэты час адбываецца фарміраванне вуснай мовы і навыкаў маўленчых зносін — асновы для станаўлення дзіцяці як асобы. Аднак чалавек, які жыве ў грамадстве, дзе функцыянуюць дзве дзяржаўныя мовы (пераважна руская і беларуская), сутыкаецца з праблемай білінгвізму (двухмоўя). У сувязі з гэтым узрастае роля установы дашкольнай адукацыі, на якую ўскладаецца адказнасць не толькі за развіццё камунікатыўных навыкаў у дзіцяці, але за фарміраванне сродкамі роднай мовы нацыянальнай самасвядомасці, за перадачу літаратурнай спадчыны, культурных традыцый, назапашаных беларускім народам на працягу гісторыі свайго існавання. Задача ўскладняецца тым, што многія дзеці і нават бацькі не толькі не ўмеюць размаўляць па-беларуску, але і не разумеюць мовы.

Такім чынам, паўстала праблема павышэння статуса беларускай мовы ва ўстанове дашкольнай адукацыі, развіцця не толькі мовы дзяцей, але і зацікаўленасці бацькоў у гучанні роднай мовы.

Адной з прычын нізкай эфектыўнасці навучання выхаванцаў беларускай мове ў рускамоўным дзіцячым садзе, на нашу думку, з’яўляецца недахоп часу, адведзенага вучэбнай праграмай на арганізацыю адпаведных заняткаў. Роднай мова становіцца тады, калі чалавек карыстаецца ёй у важных, асобасна значных або эмацыянальна яскравых сітуацыях зносін, напоўніць такімі сітуацыямі працэс навучання — задача педагога.

Абследаванне маўленчага развіцця выхаванцаў старэйшых груп, а таксама назіранні паказалі, што дзеці зусім не карыстаюцца роднай мовай у паўсядзённым жыцці і імкнуцца пазбегнуць адказаў на роднай мове. У працэсе сумеснага з дарослым разглядвання беларускай ілюстраванай дзіцячай кніжкі дзеці адказвалі на пытанні пры разглядзе малюнкаў пераважна на рускай мове, самастойныя выказванні на беларускай мове амаль зусім не гучалі. Але вельмі добра дзеці ўзнаўлялі кароткія літаратурныя вершы, у тэатралізаванай дзейнасці таксама актыўна карысталіся беларускай мовай.

Мэта нашага даследавання — развіццё беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту сродкамі выкарыстання фальклору ў розных відах дзейнасці. На пачатку даследавання былі пастаўлены наступныя задачы: прааналізаваць навуковую і метадычную літаратуру па дадзенай тэме; стварыць умовы для паспяховага авалодання беларускай мовай дзецьмі дашкольнага ўзросту; прааналізаваць выніковасць і ацаніць эфектыўнасць выкарыстання фальклорных твораў для развіцця беларускага маўлення ў дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту.

© Цалко Т. А., 2021

Репозиторий БарГУ

**Асноўная частка.** Фальклор (калыханкі, забаўлянкі, дзіцячыя песні, заклічкі, прыказкі і прымаўкі, дражнілкі, лічылкі, гульні, маўчанкі, скорагаворкі, казкі, загадкі, прыпеўкі) — найлепшы сродак выхавання і развіцця маўлення дзяцей. Дзякуючы яму, дзеці пачынаюць разумець прыгажосць беларускай мовы.

Добрымі дапаможнікамі ў нашай працы сталі кнігі розных аўтараў, сярод якіх «Выхаванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту цікавасці да беларускай мастацкай літаратуры і фальклору» Д. М. Дубінінай, дзе распрацаваны метадычныя рэкамендацыі па азнаямленні дашкольнікаў з фальклорам, прапаноўваецца не толькі завучванне, але і сумеснае з педагогам расказванне; «Развіццё беларускага маўлення дашкольнікаў ад 4 да 7 гадоў» Н. С. Старжынскай разам з наглядным дапаможнікам для дзяцей, у якім раскрываецца методыка навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове і навыкам маўленчых зносін; «Залатая скарбонка. Хрэстаматыя для дашкольнікаў», дзе змешчаны літаратурныя творы розных жанраў (пацешкі і забаўлянкі, вершы і апавяданні, народныя і аўтарскія казкі, легенды і паданні), якія ўключаны ў вучэбную праграму дашкольнай адукацыі; «Родная прырода ў вуснай народнай творчасці» Д. М. Дубінінай, дзе выкладаюцца канцэптуальныя асновы этнакультурнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту ад пятага да сёмага гадоў жыцця, раскрываюцца метады і прыёмы азнаямлення іх з прыродай роднага краю праз выкарыстанне вуснай народнай творчасці ў адпаведнасці с вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі.

Н. С. Старжынская рэкамендуе праводзіць штодзённую працу па засваенні звычаяў, традыцый, культуры беларускага народа, фарміраванні ўяўленняў аб тэрыторыі, гісторыі краіны, нацыянальных колерах, сімвалах і героях дзяржавы на беларускай мове, што правамерна, на наш погляд, у старэйшых групах, аднак не заўсёды дзецям усё зразумела належным чынам, бо асноўныя паняцці сфарміраваны на рускай мове.

Каб беларускі фальклор увайшоў у жыццё дзяцей дашкольнага ўзросту і стаў неабходным у развіцці беларускага маўлення кожнага дзіцяці, неабходна арганізаваць прадметна-развіваючае асяроддзе.

З гэтай мэтай была праведзена наступная работа: набыты малюнкі адзення розных строяў Беларусі, рушнікі, жаночы нацыянальны касцюм, лялькі ў беларускай вопратцы; аўдыязапісы беларускіх песень, казак, калыханак; створаны альбомы «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі», «Мой горад», «Праблемныя сітуацыі “Як сказаць па-беларуску”», «Легенды і паданні»; аформлены дыдактычныя гульні «Назаві па-беларуску», «Жывёлы Белавежскай пушчы», «Нацыянальныя стравы беларускай кухні», «Адгадай казачнага героя па апісанні»; картатэкі беларускіх загадак, лічылак, прыказак і прымавак, фізкультхвілінак, рухомых беларускіх народных гульняў, моўных дыдактычных гульняў, накіраваных на развіццё беларускага маўлення, маскі дзікіх і свойскіх жывёл; медальёны для рухомых гульняў; упрыгожаны беларускім арнаментам куфар; падабрана неабходная метадычная літаратура, папоўнены кніжны куток літаратурнымі творамі розных жанраў на беларускай мове.

Беларускі фальклор — адна з умоў развіцця маўлення дзяцей, і ён будзе адыгрываць большую ролю тады, калі выхавацель ажыццяўляе педагагічнае кіраўніцтва паступова, выкарыстоўваючы выразныя сродкі беларускага народнага фальклору, стварае эмацыянальна-станоўчыя абставіны, не разбурае ініцыятыву і свабоду выбара дзіцяці [1, с. 9].

Ва ўстанове дашкольнай адукацыі ўведзены адзіны дзень зносін на беларускай мове — чацвер. Асноўнымі формамі працы па азнаямленні дзяцей з беларускай мовай і беларускімі нацыянальнымі традыцыямі з’яўляецца як спецыяльна арганізаваная, так і нерэгламентаваныя віды дзейнасці. Гэта гульнізаняткі, мастацка-эстэтычная і фізкультурна-аздараўленчая праца, народныя святы і забавы, выставы дзіцячага малюнка, вырабаў з прыроднага матэрыялу, дыдактычныя гульні, завучванне вершаў, чытанне і пераказ казак, гульні-драматызацыі і інш. Наша практыка паказала, што аднаго дня вельмі мала, таму ўключылі мову штодзённа ў спрыяльныя сітуацыі або ў пэўныя рэжымныя моманты, карыстаючыся правілам «адна асоба — адна мова» або «адна сітуацыя — адна мова».

Кожны дзень дзіцяці ва ўстанове дашкольнай адукацыі павінен быць напоўнены радасцю, усмешкамі, добрымі сябрамі, вясёлымі гульнямі. А гульня — самая любімая дзіцячая дзейнасць, вось і сталі ўключаць усе гульні на беларускай мове, пераважна беларускія народныя з дыялогамі: «Бабка Ёжка», «Вожык і мышы», «Адгадай, чый галасок», «Грушка», «Лянок», «Гарлачык», «Схавай рукі» з пацешкай «Сонейка». Песні «Знайшоў коцік паясок» абыгрывалі з нацыянальным поясам, хавалі, а той, хто ў крузе, адгадваў, у каго, гульні-імітацыі з забаўлянкамі «Кукарэку певунок» і «Ягорачка», «Ах, ты, коцінька-каток», «Ішла каза», у працэсе гульні дзеці запаміналі словы, а калі была неабходнасць паўтарыць, карысталіся мадэлямі Т. А. Ліра. Так, паступова ўводзілі беларускую мову ў розныя віды дзейнасці дзяцей (лепку, маляванне, музыку, працу) з мэтай развіцця ў малых першапачатковых навыкаў разумення мовы, умення паўтараць за выхавальнікам і па меры магчымасці самастойна ўзнаўляць узоры беларускага маўлення (асобныя словы, кароткія пацешкі, песні, лічылкі), што служыла фарміраванню ў іх пачуццёвай асновы руска-беларускага двухмоўя. Ужо праз месяц, калі дзеці чулі беларускую мову, з радасцю крычалі: «Ура! Зараз гуляць будзем», праз паўгода — размаўляць па-беларуску стала звычайнай справай для дзяцей.

У сярэдняй группе працягвалі навучанне выхаванцаў рэпрадуктыўнаму маўленню (пераказ, завучванне і ўзнаўленне паэтычных твораў). Актыўна выкарыстоўвалі у паўсядзённым жыцці гутаркі, апавяданні на беларускай мове, разглядванне карцін, малюнкаў, ілюстрацый, камунікатыўныя сітуацыі, драматызацыю беларускіх народных казак («Каза-манюка», «Зайкава хатка», «Як курачка пеўніка ратавала», «Коцік, пеўнік і лісіца» з дапамогай лялечнага тэатра, тэатра масак). Праз гульні-драматызацыі дзеці так-



Рэпазіторый БарДУ

сама вучацца мове. Падрыхтоўка да гульні-драматызацыі дае магчымасць нам вучыць дзяцей прыгожа, гучна вымаўляць словы на роднай мове, адчуваць рытм, музыку беларускага маўлення.

У нашай дашкольнай установе падчас зімовых канікул традыцыйна праходзіць Дзень беларускай народнай казкі. У гэты дзень дзеці маюць магчымасць паслухаць казкі ў выкананні выхавальніка, пагуляць у гульні-драматызацыі па матывам беларускіх народных казак, намаляваць малюнкі «Мой любімы казачны герой». Таксама дзеці старэйшых і сярэдніх групп наведваюць дзяцей малодшых груп і паказваюць ім беларускія казкі, такія як «Зайкава хатка», «Коцік, пеўнік і лісіца», «Як курачка пеўніка ратавала» і іншыя з дапамогай тэатра масак, тэатра лялек.

Ужываем беларускую мову і пры фарміраванні культурна-гігіенічных звычак, у сумеснай працы дарослых і дзяцей. Імкнёмся як мага часцей ужываць беларускія ветлівыя словы.

Калі ў мастацкую дзейнасць уключаем беларускае дэкаратыўнае маляванне нацыянальнага адзення для папяровых беларускіх лялек (якіх пасля абыгрывалі), абрусаў, рушнікоў, тады творчую дзейнасць суправаджае пераважна беларуская мова. Каб хутка і лёгка вывучыць шмат лічылак, загадак, прыказак і прымавак, просім бацькоў вывучыць з дзецьмі па адной. Мы станавіліся ў круг і пачыналі кальцоўку: той, на кім скончылі лічыць або загадваць загадку, гаварыць прымыўку або прыказку, пачынаў сваю, пакуль кожны не раскажа сваю. За кароткі час усе дзеці змаглі расказаць тое, што падрыхтавалі дома, і пазнаёміць астатніх.

Музычны і літаратурны фальклор з радасцю ўспрымаецца дзецьмі і дарослымі. У працэсе музычнай дзейнасці на занятках, а таксама ў нерэгламентаванай дзейнасці разам з музычным кіраўнікам развучваем з дзецьмі песні на беларускай мове, ладзім карагоды, выконваем беларускія народныя танцы, знаёмімся з музычнымі народнымі інструментамі. Музычныя кіраўнікі разам з выхавацелямі рыхтуюць і праводзяць фальклорныя святы «Калядкі», «Гуканне вясны», «Купалле» з беларускімі абрадамі, песнямі і пацешкамі «Ездзіць вясна, ездзіць», «Жаваронaчкі, прыляціце», «Каляды, калядкі…», карагодамі, «Ой, вясна-красна», «Го-го-го, каза», танцамі, прыказкамі і прыкметамі. На свята Раство Хрыстова дзеці старэйшых і сярэдніх груп прымаюць удзел у лялечным тэатры «Батлейка» і знаёмяцца з гісторыяй узнікнення гэтага свята.

У нашай установе дашкольнай адукацыі традыцыйна сталі праводзіць Міжнародны дзень роднай мовы. Раніцай дзеці разам з выхавальнікам у беларускіх строях сустракаюць бацькоў на ўваходзе ў дзіцячы сад. Віншуюць іх з Міжнародным днём роднай мовы, прапануюць пагуляць у гульню «Перакладчыкі». Бацькі з задавальненнем дастаюць з кошыка напісаныя на беларускай мове словы і перакладаюць іх на рускую.

У сваёй рабоце па навучанні дзяцей беларускай мове выкарыстоўваем інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі. Распрацаваны канспекты заняткаў для дзяцей старэйшай группы «Свая хатка, як родная матка», «Па старонках роднай мовы», «У гасцях у бабулі Настачкі».

З мэтай павышэння псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці бацькоў асаблівую ўвагу надаём нагляднаінфармацыйным формам работы. Кожны чацвер у бацькоўскім кутку ў групах выхавальнікі афармляюць рубрыку «Размаўляй са мной па-беларуску», дзе размяшчаюць парады для бацькоў, тлумачэнне беларускіх слоў, вершы на беларускай мове, лічылкі, забаўлянкі, пацешкі, гульні і задані для развіцця беларускага маўлення. Асаблівай папулярнасцю карыстаецца плакат «Маё любімае беларускае слова», дзе бацькі могуць пазнаёміцца з новымі словамі, якія дзеці вывучылі на занятку па развіцці беларускага маўлення і культуры маўленчых зносін.

На нашу думку, толькі выкарыстанне творчага падыходу да выхавання, аб'яднанне класічных і сучасных метадаў і прыёмаў арганізацыі работы з дзецьмі і бацькамі, з вузкімі спецыялістамі, уключэнне ў змест выхаваўчага працэсу інавацыйных тэхналогій побач са сродкамі народнай педагогікі і, галоўнае, жаданне дапамаглі дасягнуць станоўчых вынікаў і забяспечыць якасць адукацыйнага працэсу.

Эфектыўнасць выкарыстання дадзеных форм і метадаў у нашай установе пацвярджаецца тым, што дзеці старэйшых груп не толькі разумеюць беларускую мову, але і карыстаюцца ёй падчас гульняў, пераказваюць казкі практычна на беларускай мове — як знаёмыя, так і ўпершыню пачутыя. Усе дзеці могуць расказаць некалькі забаўлянак, лічылак, прыказак і прымавак, загадаць загадку, праспяваць вывучаныя беларускія народныя песні, гуляюць у народныя гульні з вялікай ахвотай.

Праведзеная работа паказала станоўчы ўплыў на зацікаўленасць бацькоў у выхаванні дзяцей на роднай мове, якія раніцай прывітаюцца па-беларуску і шчыра ўсміхаюцца, калі дзеці расказваюць пабеларуску, што рабілі без іх.

**Заключэнне.** Вынікі праведзенай педагагічнай работы пацвярджаюць, што галоўным фактарам у развіцці беларускага маўлення з'яўляецца ўзор правільнай мовы выхавальніка, жаданне ўжывання мовы ў штодзённым жыцці ўсімі ўдзельнікамі педагагічнага працэсу. Правядзенне не толькі гульняў, святаў, але і арганізацыя ўсяго адукацыйнага працэсу на беларускай мове раўназначна, як і на рускай. Кожны беларус павінен ведаць сваю мову, а размаўляць на ёй або не — кожны вырашае для сябе сам.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Дубініна, Д. М.* Выхаванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту цікавасці да беларускай мастацкай літаратуры і фальклору : дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі / Дз. М. Дубініна. — Мінск : Новое знание, 2016. — 208 с.



Репозиторий БарГУ